# СТАРШЫНЯ САЎНАРКОМА

Ішоў ліпень 1920-га. Чырвоная Армія толькі што вызваліла Мінск ад польскіх легіянераў. Для аднаўлення і ўмацавання Савецкай улады ў горад прыбыў зацверджаны ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі Мінскі губернскі рэўком. У састаў яго ўваходзіў Іосіф Аляксандравіч Адамовіч, ваенны камендант Смаленска.

Нарадзіўся Іосіф Аляксандравіч 26 снежня 1896 г. (7 студзеня 1897 г.) у Барысаве. У сям'і Адамовічаў было шасцёра дзяцей. Бацькоўскіх заробкаў не хапала, і дзецям пра вучобу задумвацца не даводзілася. Таму Іосіф скончыў толькі царкоўнапрыходскую школу. У 12 гадоў пайшоў працаваць на гліянапасудную фабрыку ў Нова-Барысаве. У 1914 г. Адамовіча мабілізавалі ў царскую армію. Трапіў ён на Паўднёва-Заходні фронт, даслужыўся да чыну старшага унтэр-афіцэра, атрымаў тры георгіеўскія крыжы. Але гэта не адасобіла яго ад салдат-акопнікаў. Разам з імі хадзіў у атакі, разам употай чытаў бальшавіцкія лістоўкі, пільна сачыў за падзеямі ў Петраградзе.

У час Лютаўскай рэвалюцыі Адамовіч служыў у 310-м Шацкім палку, уваходзіў у палкавы камітэт. Салдаты выбралі яго ў састаў Харкаўскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У ліпені, калі контррэвалюцыя перайшла ў наступленне, увяла на фронце расстрэл, І. А. Адамовіч быў абвінавачаны ў рэвалюцыйнай дзейнасці і адпраўлены пад кулі, на Паўднёва-Заходні фронт. Восенню 1917 г., паранены, знясілены, але не зломлены, Адамовіч вярнуўся ў родны Барысаў.

Загартаваны фронтам, палітычна свядомы, Іосіф Аляксандравіч карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод рабочых і салдат, якія абралі яго сакратаром выканкома Барысаўскага павятовага Савета. Разам з імі Адамовіч усталёўваў у павеце Савецкую ўладу, праводзіў у жыццё першыя рэвалюцыйныя дэкрэты. У пачатку 1918 г. уступіў у рады ленінскай партыі, добраахвотна запісаўся ў Чырвоную гвардыю, на чале сфарміраванага ім чырвонагвардзейскага атрада змагаўся супраць германскіх войск на подступах да роднага горада і пад Магілёвам. У Смаленску, куды з Мінска ў лютым 1918 г. пераехалі партыйныя і савецкія органы Заходняй вобласці і штаб Заходняга фронту, ён прымаў актыўны ўдзел у рабоце штаба па фарміраванню чырвоных палкоў. Гэтыя першыя фарміраванні Чырвонай Арміі сталі насмерць пад сценамі горада, спыніўшы наступленне германскіх войск.



І. А. Адамовіч.

Партыя даручыла Адамовічу новае заданне. Узначаліўшы губернскі ваенны камісарыят, ён наладжваў абучэнне маладога папаўнення Чырвонай Арміі.

Вытрыманым камандзірам, загартаваным бальшавіком праявіў сябе Іосіф Аляксандравіч вясной 1918 г. у Смаленску. Там, непадалёк ад дэмаркацыйнай лініі, што раздзяляла германскія войскі і атрады Чырвонай Арміі, сабралася нямала былых афіцэраў. Найбольш свядомыя з іх уступілі ў Чырвоную Армію, іншыя спадзяваліся ўзняць мяцеж і адкрыць немцам дарогу ў глыб Расіі. На адным з мітынгаў контррэвалюцыя-



Удзельнікі 9-й мінскай акруговай партканферэнцыі. І. А. Адамовіч у трэцім радзе чацвёрты злева.

неры падбухторвалі чырвонаармейцаў на антысавецкае выступленне. І. А. Адамовіч выкрыў намер афіцэраў, растлумачыў контррэвалюцыйны характар змовы.

У канцы 1918 г. пачалося вызваленне Беларусі ад кайзераўскіх войск. Паўднёва-Заходні камітэт РКП(б) прызначыў І. А. Адамовіча ваенным камісарам Магілёўскай губерні і Лепельскага павета. Па ўсіх правілах вайсковай стратэгіі і тактыкі пад яго кіраўніцтвам была распрацавана і ажыццёўлена аперацыя па знішчэнню стракапытаўцаў, якія ўзнялі контррэвалюцыйны мяцеж у Гомелі. Жлобінскі атрад, ваенным камісарам якога быў Адамовіч, размясціўся непадалёк ад чыгуначнай станцыі Уза. Адсюль ён накіраваўся на Гомель. Задача заключалася ў тым, каб прымусіць мяцежнікаў адступаць на Навазыбкаў. Бліскуча задуманая аперацыя закончылася выдатна. Мяцежнікі трапілі ў расстаўленую пастку і склалі зброю. Умела дзейнічаў Адамовіч і ў маі 1919 г., калі ў Горацкім павеце пачалі арудаваць бандыты.

...Чырвоная Армія імкліва вяла наступленне на Варшаву. І. А. Адамовіч разам з В. Г. Кнорыным, А. Р. Чарвяковым разгарнулі шырокую работу па папаўненню Чырвонай Арміі свежымі сіламі, боепрыпасамі, прадуктамі харчавання, адзеннем і абуткам. У канцы верасня 1920 г. у Чырвоную Армію было накіравана 68 тыс. чалавек, з іх каля 8 тыс. камандзіраў. За паспяховае правядзенне ваенна-мабілізацыйнай работы І. А. Адамовіч быў узнагароджаны залатым імянным гадзіннікам, а крыху пазней і імяннай зброяй.

Скончылася грамадзянская вайна, аднак рэшткі контррэвалюцыйных недабіткаў яшчэ марылі аб рэстаўрацыі старых парадкаў, перашкаджалі будаваць сацыялізм. Банды Булак-Балаховіча, Савінкава, Моніча і іншых, 85 груп агульнай колькасцю звыш 5 тыс. чалавек, катаваннямі і забойствамі спрабавалі запалохаць працоўных, пасеяць недавер да мерапрыемстваў Савецкай улады.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы